*Жыве Беларусь!*

# БЕЛАРУС

Address: P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

BIELARUS/Belarusan newspaper in Free World ISSN 1054-9455
Published by the Belarusan American Association, Inc.

№ 545 Чэрвень 2008 г.
Год выданьня 58

# Хіратонія новага япіскапа

Адбылася даўгачаканая на эміграцыі падзея – хіратонія новага япіскапа Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы. Ім стаў япіскап Сьвятаслаў.

Пасьля сьмерці Першагерарха БАПЦ Мітрапаліта Ізяслава (26 лістапада 2007 году), БАПЦ асірацела, і яе апекуном быў архіяпіскап Уманьскі і Дэтройтаўскі ЎАПЦ Аляксандар.

11 травеня 2008 году герархамі Ўкраінскае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы ў ЗША архіяпіскапам Аляксандрам і япіскапам Тэхаскім і Г'юстанскім Макарыосам, з удзелам япіскапа Барыспальскага Пасія (УПЦ Кіеўскі Патрыярхат) хіратанізавалі япіскапа Сьвятаслава на япіскапа Навагрудзкага і Паўночна-Амэрыканскага БАПЦ за Боскаю літургіей у катэдральным саборы сьв. Кірылы Тураўскага БАПЦ у Нью-Ёрку.

На гэты-ж дзень прыпадала парафіяльнае сьвята сабору. Архіяпіскап Аляксандар у сваім віншаваньні япіскапу Сьвятаславу даў добрыя парады, выказаў пажаданьні, дзе ён нагадаў: "Дзень 11 траўня 2008 году ёсьць не падвоенае сьвята, а патроенае, ад гэтага дня – пачатак новага адраджэньня БАПЦ".

На ўрачыстасьці прысутнічалі шматлікія госьці зь Нью-Ёрку, Нью-Джэрзі, Кліўленду і Канады. Акрамя царкоўных актывістаў там прысутнічалі і нашыя палітычныя дзеячы: Івонка Сурвілла, Зянон Пазьняк, Вячка Станкевіч.

Царкоўнаю радаю БАПЦ япіскап Сьвятаслаў абраны Адміністратарам Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы.



*Япіскап Сьвятаслаў (у міру Вячаслаў Логін) нарадзіўся 26 лістапада 1964 году ў Чарнігаве (Украіна) у сям'і інжынэраў Вячаслава і Людмілы (Сіз). (Род паходзіць з Наваградчыны, дзед Андрэй Логін і ягоны брат Язэп, расстраляныя ў 1930-я г.г., былі беларускімі фальклярыстамі (гл. Энцыклапедыя Літаратуры і Мастацтва Беларусі, т.3, б.291); дзед па лініі маці Даніла Сіз у 1930-я гады скончыў Гомельскі чыгуначны тэхнікум.)*

*У 1986 г. скончыў Кіеўскі палітэхнічны інстытут, працаваў інжынэрам.*

*У 1994-1999 г.г. навучаўся ў Кіеўскай духоўнай сэмінарыі, пасьля сканчэньня якой, у 1999-2000 г.г., навучаўся на Тэалягічным факультэце Манітобскага ўнівэрсытэту (Праваслаўны Калегіум сьв. ап. Андрэя ў Вініпэгу, Канада).*

*27 жніўня 2000 г. рукапакладзены ў сан дыякана, а 17 сьнежня 2000 г. у сьвятара ў царкве сьв. К. Тураўскага БАПЦ ў г. Таронта (Канада) і прызначаны на гэтую-ж парафію.*

*У 2002-2007 г.г. служыў настаяцелем парафіі Жыровіцкай Божай Маці БАПЦ у г. Гайленд-Парку (штат Нью-Джэрзі, ЗША).*

*У 2005-2006 г.г. быў выконваючым абавязкі настаяцеля катэдры сьв. К. Тураўскага БАПЦ у г. Нью-Ёрк (ЗША).*

*З 2007 г. – настаяцель парафіі сьв. К. Тураўскага ў Таронта.*

*У кастрычніку 2006 г. царкоўнаю радаю БАПЦ аднагалосна абраны кандыдатам у япіскапы.*

*У лютым 2008 г. прымае манашы пострыг зь імём Сьвятаслаў у манастыры сьв. Чатырох Эвангелістаў (УАПЦ у ЗША) у г. Г'юстан (штат Тэхас, ЗША).*

*24 лютага 2008 г. у катэдры сьв. ап. Андрэя Першазванага ў г. Дэтройт (штат Мічыган, ЗША) архіяпіскапам Аляксандрам (УАПЦ у ЗША) узьведзены ў сан ігумена і архімандрыта.*

# УЛАДА ЦЕМРЫ



**Зянон ПАЗЬНЯК**

***Старшыня Беларускага Народнага Фронту "Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ***

У гэтым артыкуле я пазначу некалькі тэмаў, істотных для нашай пазыцыі і палітычнае барацьбы.

Мы бачым, што антыбеларуская палітыка і перасьлед усяго беларускага ўзмацняюцца. Краінай ужо амаль 14 гадоў кіруе чужая агрэсіўная цемра. Мы бачым таксама паэтапны плян вынішчэньня асноваў культурнага існаваньня Беларускай нацыі. Гэты плян выконваецца мэтанакіравана і пасьлядоўна. Парадак, сэнс і зьмест яго выканаваньня вышэйшы за інтэлектуальныя магчымасьці чалавека, у руках якога апынулася ўся ўлада ў Беларусі. Тым часам якраз ён зьяўляецца пасьлядоўным і адэкватным яго выканаўцам. Антыбеларуская фобія знайшла адпаведную парадыгму палітыкі, распрацаваную ў лубянскай Маскве.

Для фобіі няма нічога сьвятога і ніякіх табу, усё дазволена. Характэрная мадэль паводзінаў у стане фобіі – зьдзек і кашчунства, абплёўваньне вялікага, блюзьнерства над сьвятым. Фобія, як правіла, спадарожнічае паранойі і псыхапатыі. Усімі гэтымі рысамі ад самага пачатку характарызуецца палітыка антыбеларускага рэжыму на Беларусі (парваньне Беларускага Сьцягу, спаленьне беларускіх падручнікаў, зьдзек і зьнявага Беларускай мовы, ліквідацыя беларускіх школаў, гімназіяў і ліцэяў, абплёўваньне імя Васіля Быкава, блюзьнерства над Францыскам Скарынам і вялікімі людзьмі Беларускай нацыі, разбурэньне і перароблка знакавых помнікаў гісторыі і культуры, мэтанакіраванае псаваньне нацыянальнага краявіду і вынішчэньне запаведнай прыроды, грэблівыя адносіны да беларускіх людзей, беларускай творчасьці і літаратуры, нянавісьць да маладых і да вольнага чалавека.

Гэта цягнецца ўжо з году ў год, ганебна і прыніжальна для асобы, для культурнай нацыі. Усё гэта – характэрныя праявы рэжыму ўнутранай акупацыі. Беларусы сталіся закладнікамі чужой палітыкі. Псыхалёгія закладнікаў даўно прагладаецца ў нашым нацыянальным становішчы. Асноўная маса людзей, паралізаваная страхам, маўчыць. Частка супрацоўнічае з "тэрарыстамі" і хваліць бандзюг. Асобныя людзі паўстаюць супраць гвалтаўнікоў і гінуць; нязгодныя цярпяць рэпрэсіі і перасьлед, які набывае пачварныя формы.

Культывуецца злачынная сталінская ідэалёгія, аднаўляюцца разбуральныя мэтады сталінізму. Як і пры сталінізме, за часы савецкай акупацыі ў 30-х гадох, антыбеларускі рэжым, які ня ведае і не карыстаецца беларускай мовай, прыдумаў рэпрэсіўны правапіс беларускай мовы як мэтад яе масавага вынішчэньня.

За напісаньне, нязгоднае з гэтым прыдуманым правапісам, і за артаграфічныя памылкі (прытым ва ўсіх сфэрах жыцьця) кожнага грамадзяніна Беларусі і людзей без грамадзянства будуць караць штрафам, выганяць з працы і вучобы, ужываць іншыя мэтады пакараньня (як пляную
ць некаторыя ненавісьнікі Беларусі, аж да пасадкі ў турму).

Мэта гэтага шызафрэнічнага закону – легальным чынам забараніць беларускую мову. Страх перад штрафам, перад стратай працы, вучобы, перад іншым пакараньнем павінна, па паранойнай лёгіцы беларусафобнага "заканадаўства", адбіць жаданьне ў людзей пісаць па-беларуску, здаваць экзамены і нават пісаць лісты (ня кажам ужо пра газэты і кнігі) на беларускай мове. Усё скіравана на тое, каб беларусы сталі пісаць толькі па-расейску.

Чужая расейская мова, якую антыбеларускі рэжым зрабіў сваёй "дзяржаўнай", гэтаму закону не падлягае. Пішы, маўляў, хоць "харашо", хоць "жэстачайшэ плоха" – "сайдзёт". "Закон" цынічна дыскрымінацыйны да беларусаў. Тут груба парушана ўсё, што магчыма было парушыць: Канстытуцыя, міжнародныя законы і права, правы асобы, лёгіка, маральнасьць і здаровы сэнс. Характэрна, што ніхто ня ведае, што гэта за "правапіс", не было ніякага грамадзкага азнаямленьня (тым больш, абмеркаваньня). Невядома нават, хто яго пісаў (аўтары, нейкія псэўданавуковыя рэцэнзенты. Здаецца, ніхто зь іх яшчэ не аб'явіўся (не падпісаў сабе нацыянальны вырак), а "закон" падрыхтавалі ўжо да прыняцьця ў апошнім чытаньні.

Тут нават не настолькі ўражвае і абурае дзікунства такога "закону", колькі той грубы, прымітыўны і выраблены цынізм, зь якім адбываецца вынішчэньне беларускай мовы. Ліквідацыя беларускай мовы ёсьць (і быў заўсёды) галоўны пункт маскоўскай акупацыйнай палітыкі ў Беларусі.

Цынізм, фобія, жорсткасьць, блюзьнерства, зьдзек і хлусьня – тыповыя дачыненьні ў адносінах акупацыйных уладаў зь беларускім насельніцтвам. Абдзіраюць нават бедных і няшчасных, карыстаючыся з гора й бяды. Увялі ў практыку, напрыклад, браць грошы з пагарэльцаў як аплату за тушэньне пажару. З пункту гледжаньня права, тут грубае парушэньне, бо пажарная служба – гэта дзяржаўная справа. Яна ўтрымліваецца і дзейнічае за кошт падаткаў, якія плаціць у бюджэт кожны беларус (і кожны патэнцыйны пагарэлец). Браньне грошай зь няшчаснага пагарэльца (ды яшчэ праз пракуратуру і суды) – гэта ёсьць антыправавае вымагальніцтва рэжыму з выкарыстаньнем

**Працяг на бачыне 6**

Bielarus545C.qxd 6/6/2008 11:07 PM Page 4



# Сустрэча зь перакладчыкам

У Лёндане 17-га траўня 2008 году па запрашэньню Згуртаваньня Беларусаў у Вялікай Брытаніі і Ангельска-Беларускага Таварыства, прайшла сустрэча зь беларускім перакладчыкам і выдаўцом, – спадаром Віталем Воранавым.

Спадар Воранаў прэзэнтаваў свой пераклад з ангельскай на беларускую мову вядомай ва ўсім сьвеце кнігі для дзяцей А. Мілна “Winnie-the-Pooh”.

Напачатку сустрэчы, намесьнік Старшыні ЗБВБ М. Пачкаеў павітаў шаноўнага госьця і прысутных, і ў прыватнасьці зазначыў, што цягам апошніх гадоў Згуртаваньне з зацікаўленасьцю ставіцца да выдавецкіх праектаў у Беларусі, скіраваных на разьвіцьцё гісторыі і культуры.

У час прэзэнтацыі сп. Воранаў распавёў пра існуючыя варыянты перакладаў гэтай кнігі на іншыя мовы, адзначыўшы, на ягоную думку, больш ці меньш цікавыя зь іх, падрабязна засяродзіўся на праблемах зь перакладам, з якімі яму прыйшлося сутыкнуцца на працягу творчай працы.

У дыскусіі бралі ўдзел Старшыня Ангельска-Беларускага Таварыства Джым Дзінглі, прафэсар А. МакМілан, прадстаўнік Трасту (Pooh Properties), К. Мацкевіч, іншыя асобы.

Напрыканцы сустрэчы прысутныя падзякавалі сп. Воранаву за тое, што празь ягоную працу беларускія дзеці атрымалі цудоўную магчымасць далучыцца да сусьветных каштоўнасьцяў і пажадалі яму натхненьня і далейшых творчых посьпехаў.

Пасьля афіцыйнай часткі, шмат хто скарыстаў нагоду паразмаўляць сам на сам з аўтарам перакладу і выдаўцом кнігі “Віня-Пых”.

Сустрэча і прыняцьцё адбываліся ва ўтульных залях Украінскага Рэлігійнага Цэнтру, што ў Заходнім Лёндане.

*Управа ЗБВБ*

# Вечарына ў Празе

У вечары 4 траўня ў праскай кавярні «Сіці» прайшла вечарына памяці беларускага паэта Анатоля Сыса (1959-2005), прымеркаваная да трэціх угодкаў ягонай сьмерці. Яе ініцыятарам ды арганізатарам стаў грамадзянін Беларусі і жыхар чэскай сталіцы Аўген Сідорык. Сабралася зь некалькі дзясяткаў асобаў узростам ад двух да сямідзесяці гадоў.

Сваімі ўспамінамі пра паэта дзяліліся журналісты “Радыё Свабода” Сяргей Шупа і Сяргей Абламейка, бард Андрэй Мельнікаў, а таксама людзі, якім даводзілася бачыць выступы Анатоля Сыса, назіраць яго ў публічным жыцьці. Гучалі вершы і песьні, жывы голас паэта, захаваны гуказапісам.

Імпрэза прыцягнула ўвагу ня толькі беларусаў. І, адпаведна, былі пытаньні пра асобу паэта і адказы на іх, якія прыўнесьлі ў шанаваньне памяці разынку асьветніцтва. Межы размовы часам пашыраліся да расповеду пра Беларусь, як краіну, і яе літаратурную гісторыю.

Лепшым чытальнікам вершаў Анатоля Сыса быў прызнаны Віталь Цімошчанка. За што атрымаў у якасьці прызу “Лён” — зборнік выбраных твораў паэта, выдадзены “Кнігазборам” у 2006-м годзе.

*Андрэй МЕЛЬНІКАЎ*




**А. Мельнікаў (зьлева) і вядучы вечарыны Сяргей Шупа.**

# Новы Акт аб дэмакратыі ў Беларусі

Законапраект аб прадаўжэньні яшчэ на два гады Акту аб дэмакратыі ў Беларусі ўнесены на разгляд у Палату прадстаўнікоў Кангрэсу ЗША. Падобны акт быў прыняты Кангрэсам у 2004-м годзе, у 2006-м яго дзеяньне было прадоўжана яшчэ на два гады.

Ініцыятарам новага прадаўжэньня дзеяньня Акта аб дэмакратыі выступіў ягоны аўтар кангрэсмэн Крыс Сьміт і яшчэ дзевяць членаў Палаты прадстаўнікоў.

У абноўленым дакумэнце прыведзеныя дадзеныя аб апошніх падзеях у Беларусі. У прыватнасьці, зазначана, што ў 2008 годзе “урад Беларусі вызваліў некалькі палітычных зьняволеных”, але экс-кандыдат у прэзыдэнты Аляксандар Казулін “усё яшчэ застаецца ў турме”. Апрача таго, у дакумэнце гаворыцца аб тым, што Дзярждэпартамэнт ЗША і Міністэрства фінансаў “змаглі эфэктыўна выкарыстаць Акт аб дэмакратыі для прасоўваньня заяўленых у ім мэтаў”.

У дакумэнце таксама падкрэсьліваецца, што палітыка ЗША ў дачыненьні да Беларусі можа быць зьмененая, як толькі беларускі ўрад “прадэманструе прагрэс” у пытаньні выкананьня дэмакратычных нормаў і стандартаў.

Апрача падтрымкі беларускіх праваабаронцаў, незалежных СМІ, прафсаюзаў, маладзёвых рухаў, дэмакратычных палітычных партый, асобным параграфам у абноўленым дакумэнце згадваецца падтрымка незалежнага радыё- і тэлевяшчаньня на Беларусь. У прыватнасьці, гаворыцца аб падтрымцы “Радыё свабодная Эўропа / Радыё Свабода”, радыёстанцый “Голас Амэрыкі” і “Эўрапейскае радыё для Беларусі”, а таксама спадарожнікавага тэлеканалу “Белсат”.

Акт аб дэмакратыі ў Беларусі-2006 прадугледжваў візавыя і эканамічныя санкцыі супраць ураду А. Лукашэнкі за парушэньні ў галіне дэмакратыі. Ён таксама прадугледжваў выдзяленьне ўрадам ЗША на працягу двух гадоў 55 млн. даляраў на падтрымку дэмакратыі ў Беларусі. Зь іх 40 млн. прызначалася на разьвіцьцё грамадзянскіх інстытутаў і 15 млн. — на разьвіцьцё незалежнага тэле- і радыёвяшчаньня Беларусі.

*Паводле Белапан*

# Расьпяты за крыж

***Заява для прэсы пра арышт Хурсіка Віктара (журналіста газэты “Звязда”) і кандыдата гістарычных навук Анішчанка Яўгена.***

Хурсік В. арыштаваны 15 траўня сёлета ў памешканьні Старадарожскага РАУС на 15 сутак за удзел ва ўстаноўцы мэмарыяльнага крыжа ў вёсцы Дражна на месцы забойства 25 мясцовых жыхароў атрадам 2-й Менскай партызанскай брыгады 15 красавіка 1943 году.

Памятны крыж сьвятой Еўфрасіньні Полацкай быў пастаўлены 19 красавіка па ініцыятыве мэмарыяльнай сэкцыі Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Сьвятар Акаловіч Леанід асьвяціў крыж з таблічкай, на якой выбітыя імёны “мірных жыхароў вёскі Дражна, бязьлітасна загінуўшых ад рук партызанскіх злачынцаў 15.04.1943 г.” Крыж асьвячаўся ў прысутнасьці каля 20 чалавек і празь дзень быў выдраны невядомымі.

Першым у Менску 23 красавіка былі арыштаваны і адвезены ў Старадароскае РАУС старшыня сэкцыі БДТАПГК Вячаслаў Сіўчык. Прысуд яму вынес “суд” у складзе начальніка РАУС Валчэцкага Я. Г., загадчыка ідэалягічным аддзелам райвыканкаму Каролка С. А., памочніка старшыні райвыканкаму Давыдава і двух падабраных жыхароў. За “недагляд” быў “звольнены” старшыня сельсавету Міхайлаў. Сьвятар Акаловіч вымушаны хавацца ўцёкамі ад такога шамякінага суду, а журналіст В. Хурсік пасьля ваганьняў паехаў разьбірацца на месца з матывамі перасьледу і бараніць гонар, як ахвяр партызанскіх злачынстваў, так і пацярпелых зараз.

Яго выклікалі па павестцы, у якой начальнік ААПП Флотскі А. О. загадваў яму зьявіцца 29.04.2008 г. у кабінэт № 8 да начальніка “ў якасьці ўдзельніка падзеі пры ўстаноўцы крыжа ў Дражні”. У міліцыі адразу з парога Хурсіка арыштавалі “за удзел у несанкцыянаваным мітынгу”, хаця, як мне вядома, там не гучала разгорнутых прамоў, а для высьвятленьня асобаў удзельнікаў было дастаткова здымкаў, якія вяліся тады на тэлекамэру. На пытаньні дачкі й жонкі сп. Хурсіка пра прычыны затрыманьня, начальнік РАУС крывадушна адказаў, што ён ня мае дакумэнтаў і на гэты конт ім трэба зьвяртацца ў суд.

Матывы арышту В. Хурсіка наступныя. У 2003 годзе ён выдаў кніжку “Кроў і попел Дражна”, дзе на падставе вусных і архіўных сьведчаньняў устанавіў, што ў 1943 годзе прыналёце на тамтэйшы паліцэйскі гарнізон у Дражне партызанскі атрад зьнішчыў нявінных жыхароў, сярод, як рапартаваў ягоны камандзір Ісраэль Лапідус, “разных сволочей”. Паколькі гэтыя абвінаваўчыя матэрыялы гаварылі не пра геройствы, а пра злачынствы партызанаў, то Беларускі нацыянальны архіў правёў 30 верасьня 2003 году праверку адпаведных дакумэнтаў па звароту ваеннай пракуратуры, а Міністэрства інфармацыі замовіла закрытую рэцэнзію на гэты конт.

У сувязі з распачатай траўляй Хурсік перавыдаў кніжку ў 2006 годзе з дапаўненьнямі яе новымі архіўнымі дакумэнтамі і ўспамінамі выжыўшых сьведкаў трагедыі. У гэтай кнізе ён выказаў “падзяку тым невядомым спэцыялістам, якія па заданьню дзяржаўных органаў правялі закрытае рэцэнзаваньне першага выданьня кнігі і прыйшлі да высновы аб адпаведнасьці яе зьместу фактычным абставінам спаленьня вёскі Дражня”.

Аднак нават і пасля гэтага аўтара не запрашалі на галосны і адкрыты дыспут, на якое-небудзь навукова-практычнае мерапрыемства кшталту канфэрэнцыі, круглага стала, сымпозіюма. Улады не арганізавалі ніякага выданьня спэцыяльнага зборніка дакумэнтаў ці артыкулаў з нагоды падзеі, якую сьмела ўзяўся высьветліць В. Хурсік. Ягоная спроба ўшанаваць памяць ахвяраў партызанскіх злачынстваў нiяк ня ўпісваецца ў сучасныя ўяўленьні ўладаў аб гісторыі апошняй вайны, таму яны й вырашылі расправіцца і з крыжам, і з тымі, хто яго ставіў, і з аўтарам кнігі.

Вядомы журналіст, выдавец і краязнаўца стаў ахвярай чарговага беззаконьня.

1. Яго, як і В. Сіўчыка, і Л. Акаловіча, выклікалі ў міліцыю, а ня ў суд, у якасьці ўдзельніка падзеі, а затым гвалтоўна арыштавалі там без судовага расьсьледаваньня і абгрунтаваньня.

2. Калі яго затрымалі пазасудовым парадкам у якасьці ўдзельніка акцыі, то узьнікае пытаньне, чаму тады не пасадзілі гэтак-жа ўсіх іншых удзельнікаў т. зв. мітынгу.

3. Зусім абсурдная сваёй няяснасьцю кваліфікацыя ягонага перасьледу ні то па факту правядзеньня мітынгу, ні то за ўстаноўку крыжа

4. Па словах самога арыштаванага, яго травілі паступова з 2003 году па ўсёй вертыкалі ўлады. Палітычна-ідэалягічная падаплёка перасьледу відаць, як у складзе т. зв. суду над Сіўчыкам, так і ў звальненьні з пасады старшыні сельсавету, які ня меў непасрэднага дачыненьня да мэмарыяльнай акцыі.

Пра палітычны фарс расправы гаворыць ягнячае маўчанне прыкладна 12 дзяржаўных СМІ, куды я зьвяртаўся за элементарнай салідарнасьцю зь іх пацярпелым калегам.

*Заканчэньне на бач. 3*

Bielarus545C.qxd 6/6/2008 11:07 PM Page 5



# Беларусь за месяц

## Грамадзтва і палітыка

26—27 траўня прайшоў суд над трыма маладымі актывістамі дэмакратычнага руху: Міхаілам Субачам, Паўлам Вінаградавым і Міхаілам Дашуком. Субача і Вінаградава асудзілі на два гады, а Дашука на 1,5 году абмежаваньня волі без накіраваньня ў папраўчыя ўстановы. Цяпер іх за любое правапарушэньне могуць адправіць у турму.



*Зьлева направа: Міхаіл Субач, Павал Вінаградаў, Максім Дашук.*

10 студзеня прадпрымальнікі і дэмакратычныя актывісты выступалі супраць указа прэзыдэнта № 760 ад 29 сьнежня 2006 года, які дазваляе індывідуальным прадпрымальнікам наймаць на працу толькі блізкіх сваякоў. Падчас правядзеньня акцыі на некаторы час быў перакрыты рух на праспэкце Незалежнасьці. Па факце “масавых беспарадкаў у цэнтры Менску” была распачата крымінальная справа.

Субача, Вінаградава і Дашука вінавацілі ў тым, што падчас мітынгу прадпрымальнікаў яны “груба парушалі грамадзкі парадак, бралі ўдзел у мітынгу, ведаючы пра тое, што ён не санкцыянаваны, а таксама, “ведучы за сабою мітынгоўцаў, выкрыквалі лёзунгі”, не рэагавалі на папярэджаньні супрацоўнікаў міліцыі і перакрылі праездную частку праспэкту Незалежнасьці”.

Месяц таму, 22 красавіка, былі абвешчаныя першыя прысуды па гэтай справе. Андрэй Кім быў асуджаны да паўтары годы пазбаўленьня волі (яго абвінавацілі ў зьбіцьці супрацоўніка ДАІ падчас мітынгу прадпрымальнікаў 21 студзеня).

Міхаіл Пашкевіч, Тацяна Цішкевіч, Міхаіл Крываў, Аляксей Бондар, Арцём Дубскі, Алесь Стральцоў, Алесь Чарнышоў атрымалі па 2 гады абмежаваньня волі без накіраваньня ў калёніі адкрытага тыпу. Антона Койпіша і Ўладзімера Сяргеева пакаралі штрафам па 3,5 млн рублёў.

Яшчэ адзін абвінавачаны Аляксандар Баразенка, які навучаецца ў польскім Уроцлаве, вырашыў не вяртацца на Радзіму. Ён абвешчаны ў вышук.

## Пляны Лукашэнкі

“Буду балятавацца на чацьверты тэрмін”, - заявіў ён у інтэрвію інфармацыйнаму агенцтву Reuters. А. Лукашэнка, у прыватнасьці, сказаў: “Калі сытуацыя будзе такой, як цяпер, і са мной асабіста і ў краіне, то я, зразумела, буду балятавацца на чарговы тэрмін. Пакуль я здаровы чалавек, народ ня так моцна мяне крытыкуе, і Захад пачынае гэта разумець. Гэта магчыма. Разьлічвайце на горшае”.

Дарэчы, апошнім часам увага грамадзкасьці і мэдыяў прыкута да самага малодшага сына Лукашэнкі – чатырохгадовага Мікалая. Кажуць, што гэты сын не ад асноўнай сям'і. З маленькім хлопчыкам Лукашэнка зьяўляўся на грамадзкіх імпрэзах, езьдзіў па рэгіёнах, працаваў на суботніку. Урэшце дзяржаўныя мэдыі прыадчынілі таямніцу. Падчас візыту ў Белавескую пушчу, хлопчык назваў Лукашэнку татам, а той яго – сыночкам.

## Выбары

Грамадзкая ініцыятыва “Хартыя'97” выступае за байкот выбараў у парлямэнт, якія павінны прайсьці пры канцы верасьня сёлета. Заявілі таксама пра свой няўдзел сябры КХП-БНФ. Афіцыйна Малады фронт – як арганізацыя – не ўдзельнічае ў выбарах, але яго сябры ідуць на выбары як незалежныя кандыдаты.

Большасьць дэмакратычных партый пакуль выступаюць за ўдзел у выбарах. На іх думку, гэта адна з магчымасьцяў працаваць зь людзьмі. Лідэры палітычных партый будуць балатавацца ў Менску: гэта і старшыня АГП Анатоль Лябедзька, кіраўнік Партыі камуністаў Сяргей Калякін, былы старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка, старшыня зьліквідаванай уладамі Партыі працы Аляксандар Бухвостаў, намесьнікі сёньняшняга старшыні БНФ Алесь Міхалевіч і Аляксей Янукевіч. Балатуецца былы кіраўнік Нацыянальнага банку Станіслаў Багданкевіч, ідзе на выбары і дачка палітвязьня Аляксандра Казуліна – Вольга.

Увогуле актывісты апазыцыі вылучаныя амаль на ўсе акругі.

## Адзіная стаўка падатку

У Беларусі, верагодна, будзе ўведзена адзіная стаўка падаходнага падатку: 12%. Канцэпцыю распрацавала Міністэрства фінансаў, але канчатковага рашэньня пакуль не прынята.

Цяпер у краіне дзейнічае прагрэсіўная шкала выплаты падаткаў ў залежнасьці ад велічыні заробку. Для фізычных асоб дзейнічае цэлых пяць ставак: ад 9 да 30% ад даходу. Пераход да адзінага падатку спрасьціў-бы сыстэму спагнаньня падаткаў.

## “Нафтан” і “Палімір” прададуць

Разглядаецца варыянт продажу акцыяў самых прыбытковых і самых прывабных прадпрыемстваў адзіным гаспадарчым комплексам – “Белнафтахімам”, супраць якога дзейнічаюць санкцыі ЗША і Эўразьвязу.

Да канца году канцэрн плянуе падаць на разгляд ураду прапановы па прыватызацыі прадпрыемстваў “Палімір” і “Нафтан”

Хутчэй за ўсё, доля інвэстара будзе роўнай зь дзяржаўнай: 50 на 50. Аценку прадпрыемстваў правядуць міжнародныя экспэрты. Згодна з праграмамі разьвіцьця ў “Палімір” неабходна інвэставаць $1,8 млрд, а ў “Нафтан” — звыш $600 млн, паведамляе інфармацыйная кампанія БелаПАН.

## Малапачэснае лідэрства

Беларусь – сусьветны лідэр па ўзроўні самагубстваў. Такія зьвесткі Сусьветнай арганізацыі аховы здароўя. У пяцёрцы краін з самым высокім узроўнем суіцыдаў таксама Расея, Украіна, Летува, Эстонія. Высокім лічыцца паказьнік 20 выпадкаў на 100 тыс. насельніцтва. У Беларусі рэгіструюцца 41,5 выпадка на 100 тыс. чалавек.

Таксама беларусы прызнаныя інтэрнэт-парталам World Database of Happiness, побач з Малдовай, Узбэкістанам, Руандай і Зымбабвэ, адной з самых няшчасных нацый на сьвеце. Затое самыя шчасьлівыя краіны: Швайцарыя і Данія. Далей ідуць Аўстрыя, Ісьляндыя, Фінляндыя, Аўстралія, Швэцыя, Канада, Гватэмала, Люксэмбург, Ірляндыя, Мэксыка й Нарвэгія. Як бачым, за выняткам Гватэмалы й Мэксыкі, а таксама заможных англасаксонскіх Канады і Аўстраліі – гэта стабільныя краіны Эўропы

World Database of Happiness - інтэрнэт-партал, дзе сабраныя матэрыялы, прысьвечаныя навуковаму вывучэньню шчасця. Яго стварылі ўнівэрсытэт Эразма Ратэрдамскага ў Нідэрляндах і сацыёляг і псыхоляг Рут Вэнховэн.

## 11-гадовая школа

Падрыхтаваны адпаведны праект дэкрэту прэзыдэнта, што тычыцца пытаньняў сярэдняй адукацыі. Згодна з ім, лічыцца мэтазгодным устанавіць 11-гадовы тэрмін атрыманьня агульнай сярэдняй адукацыі. Структура сярэдняй адукацыі прадугледжвае тры ступені: 1—4 клясы, 5-9 клясы (базавая школа), трэцяя — 10-11 клясы. У школу будуць ісьці з шасьці гадоў. Паўсюль таксама ўводзіцца пяцідзёнка, у шосты дзень (субота) будуць працаваць гурткі, спартовыя сэкцыі. Навучальны год будзе зь 1 верасьня па 1 чэрвеня.

## Посьпехі Ўкраіны

Сярэдні налічаны заробак у Беларусі ў красавіку склаў 836 тыс. 980 руб. (гэта 249 эўра, або 391 даляр.

Для параўнаньня: у Расеі ў красавіку сярэдні заробак у красавіку склаў 440 эўра (688 даляраў), ва Ўкраіне - 229 эўра (362 даляры), у Эстоніі – 788 эўра (1 231 даляр). Яшчэ пару гадоў таму сярэдні заробак па Беларусі перавышаў украінскі ўдвая.

## Культура

Прадстаўнік Беларусі на самым значным эўрапейскім кантынэнтальным конкурсе песьні – “Эўрабачаньне” Руслан Аляхно заняў у паўфінале 17-е месца зь 19-ці. Конкурс сёлета праводзіўся ў Бялградзе (Сэрбія). Фінал выйграла Расея (Дзіма Білан). Украіна (Ані Лорак) заняла 2-е месца. Грэцыя – трэцяя, Армэнія – чацьвёртая. Летась прадстаўнік Беларусі Дзьмітры Калдун заняў шостае месца ў фінале.

## Пра спорт

На чэмпіянаце сьвета па хакеі, што праходзіў у траўні ў Квэбэксіці і Галіфаксе (Канада), зборная Беларусі заняла 9-е месца. Пастаўленых задач зборная ня выканала, яна мусіла ўвайсьці ў васьмёрку, як два гады таму ў Латвіі. Але захавала ня толькі месца ў эліце, але і забясьпечыла пуцёўку на Зімовую Алімпіяду 2010 году, якая пройдзе ў канадзкім Ванкувэры.

Чэмпіёнскі тытул выйграла каманда Расеі, што ў фінале адолела Канаду. У 2009 годзе чэмпіянат сьвету пройдзе ў Швайцарыі. Беларусы трапілі ў адну групу з Канадай, Славакіяй і Вугоршчынай.

Самы вядомы беларускі футбаліст – Аляксандар Глеб, відаць, пакідае лёндански “Арсэнал”. У Лёндане паўабаронца зборнай Беларусі правёў тры гады, але з “кананірамі” ні чэмпіёнскага тытулу, ні Лігі чэмпіёнаў не здабыў. Дзе прадоўжыць кар'еру футбаліст? Называюцца розныя варыянты: мілянскі “Інтэр”, а таксама тамтэйшы “Мілян”, а магчыма “Барсэлёна” ці мадрыдзкі “Рэал”.

*Уласны карэспандэнт*

## Конкурс Свабоды

Да 20-годзьдзя адкрыцьця праўды пра Курапаты, калі менавіта 3-га ліпеня 1988-га году ў “ЛіМ” быў надрукаваны артыкул Пазьняка і Шмыгалёва “Курапаты - дарога сьмерці”, Радыё Свабода ладзіла конкурс “Маё фота - мае Курапаты”. 3-га чэрвеня ў Курапатах прайшла жалобная імпрэза ўганараваньня пераможцаў, на якую сабралася каля сотні чалавек, пераважна пераможцаў конкурсу.

Жалобная імпрэза пачалася сьпяваньнем гімну “Магутны Божа”. Прыз атрымаў Юрась Беленькі. Ангеліна Масюта была ўганараваная за актыўнасьць у фіксацыі Курапатаў і за фатаздымак “Сьнежныя Курапаты”. Яна атрымала кнігу З. Пазьняка “Гутаркі з Антонам Шукелойцем”, прыёмнік і 14 кніг “Бібліятэкі Свабоды” ў PDF-фармаце, а таксама ўсе фотаматэрыялы конкурсу на флэш-карце.

Людзі ўсклалі кветкі, запалілі сьвечкі. Валер Буйвал зачытаў ліст ад грамадзкага рэдактара фатаконкурсу, адкрывальніка Курапатаў Зянона Пазьняка. У часе зачытваньня ліста адбыўся інцыдэнт, калі жанчына ўзьняла нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг, а супрацоўнікі міліцыі запатрабавалі ад яе згарнуць яго, але той застаўся лунаць побач з Крыжом пакуты.

Калі ўдзельнікі імпрэзы, у тым ліку і журналісты, спрабавалі выйсьці праз тунэль пад менскай кальцавой дарогай, міліцыянты перакрылі ім рух, і людзі вымушаныя былі вярталіся ў горад па праезнай частцы кальцавой дарогі. Міліцыя спрабавала арыштаваць Ю. Беленькага, але людзі адбілі яго, пасьля чаго той зьехаў у прыватным аўта.

Міліцыянты затрымалі Вячаслава Сіўчыка ў Курапацкім лесе, каля Крыжа пакутаў. Яны адмовіліся назваць, паводле якога артыкулу на палітыка склалі пратакол і ў чым яго абвінавачваюць. 4-га чэрвеня павінен адбыцца суд.

*Паводле Радыё Свабода*

# Расьпяты за крыж

*Заканч. з папярэдняй бач.*

В. Хурсіка належыць неадкладна вызваліць з кампэнсацыяй яму панесенай маральнай шкоды. Крымінальнаму пакараньню падлягаюць ініцыятары траўлі вядомага пісьменьніка, а таксама крывадушныя і тупыя выканаўцы гэтай абуральнай і тыпова паліцэйскай расправы над адважным выдаўцам. Пакараньне таксама павінні панесьці работнікі пракуратуры, якія дазволілі самавольства органаў міліцыі, або якія проста ці ўскосна патураюць іх рэпрэсіям над іншадумцамі і носьбітамі грамадзкіх ініцыятываў.

*Я. АНІШЧАНКА*



*А. Леанід асьвячае памятны крыж.*

Bielarus545C.qxd 6/6/2008 11:08 PM Page 6



# Мары і клопаты Марачкіных



Аляксей і Ігар Марачкіны, бацька і сын, — менскія мастакі, якіх ведаюць і ў Беларусі, і ў Амэрыцы. Яны займаліся росьпісам праваслаўнай аўтакефальнай царквы ў Кліўлендзе, работы Аляксея ўпрыгожваюць Беларускі Музэй у Нью-Ёрку і музей нонканфармізму “Zimmerli art”. У майстэрні творцаў адбыліся перамены — самы час даведацца, якія перамены адбываюцца ў іх жыцьці.

За вокнамі шуміць Няміга, амаль ужо летняе сонца асьвечвае прасторную двухпавярховую кватэру ў доме на ўзьбярэжжы Сьвіслачы. Драўляная лесьвічка зь ніжняга паверху, дзе вісяць знакамітыя работы мастакоў, і дзе яны працуюць, вядзе на верхні, на якім невялікі склад карцін і ўсялякіх прыстасаваньняў для працы. Тут стаяць керамічныя вырабы — сапраўдная выстава збанкоў, а таксама вісіць сапраўдны маляваны дыван Язэпа Драздовіча, першага беларускага мастака ў жанры “фэнтэзі”, які тварыў у 30-я гады мінулага стагодзьдзя. Звонку элітны дом, а ўнутры — нібы беларуская хатка, і жыхары яе — беларусы самыя сапраўдныя, якія пранесьлі праз усё жыцьцё жаданьне абараняць сваё. І ў тойжа час яны, прадстаўнікі старэйшага і сярэдняга пакаленьня жывапісцаў, могуць сьмела называцца наватарамі, бо ідуць у нагу з сучасным подыхам нефігуратыўнага мастацтва. Нават Злат, сын Ігара і ўнук Аляксея, ужо ў двухгадовым узросьце маляваў колеравыя экспэрымэнты ў духу Джэксана Полака. Што ўжо тады казаць пра саміх майстроў!

На карцінах Ігара, напалову абстрактных, напалову рэалістычных, бачныя прыёмы, якія ў свой час паказаў сьвету расейскі мастак Ларыёнаў. Яго “лучизм” — гэта перасячэньне на палатне каляровых промняў і энэргетычных адбіткаў ад рэчаў, сутыкненьне адценьняў і неверагодная плястычнасьць. Дзіўна, што Ігар знайшоў сябе ў гэтым з ягонай традыцыйнай адукацыяй (спэцыяльнасьць “Прамысловая графіка” былога Тэатральна-мастацкага інстытуту) і арыентацыяй на выключна беларускія матывы. “Сыну трэба пісаць у гэтым стылі больш, развівацца далей, — гаворыць Аляксей, — але ён шырокага профілю, можа і народныя сьвяты, і пейзажы традыцыйныя напісаць, дызайнам шмат займаецца”. А Ігар сам кажа, што яму вельмі падабаецца ствараць работы ў духу такога “прамянізму” (гэты тэрмін яшчэ на беларускую не пераклалі, таму прыходзіцца ўжываць такое вызначэньне), толькі не стае часу засяроджвацца на гэтым спэцыяльна. Яшчэ ён стварае дываны на сьцены, выкарыстоўваючы простыя тканіны, і хаос ламаных лініяў і сымбаляў, што выяўленыя на іх, упрыгожыць любы самы модны інтэр’ер. “Мае працы не залежваюцца, іх пастаянна раскупляюць, і як ні шкада, прыходзіцца зь імі раставацца. Вось у Брытаніі ёсць карціна “Санкі далёкага дзяцінства”, а ў менскім цэнтральным офісе “Белаграпрамбанку”, у кабінэце перамоваў, вісіць мая карціна “Сьвята куста”. Мне застаецца толькі фатаграфаваць іх і захоўваць у лічбавым выглядзе. Толькі ніяк іх не сыстэматызую, не ўпарадкую, прыходзіцца дапамагаць сябрам-мастакам, дызайнэрскай работай займацца, здымаць, а да сябе не дайду. Нават сайт не магу свой зрабіць”.

Цікава, што кампутэрнаму дызайну Ігар Марачкін навучыўся сам, усе сучасныя праграмы асвоіў бяз курсаў, хоць даўно ўжо ня школьнік. “У час вучобы, — кажа ён, — мы яшчэ ня ведалі, што такое кампутар. Нам казалі, што ў Маскве стаіць такая вялікая машына вышынёй у два паверхі, мы крычалі “ўра!” і ня ведалі, што нам давядзецца пасьля карыстацца маленькай флэшкай”. Цяпер творца з тэхнікай “на ты”, і гэта вельмі дапамагае яму ў штодзённым жыцьці. Ён працаваў над дызайнам розных альбомаў, справаздачаў пасьля штогадовых плянэраў, на якія выязджае ў складзе суполкі мастакоў і паэтаў “Пагоня”, заснаванай ў 1991 годзе Аляксеем Марачкіным. А бацька — вядомы ілюстратар кніг на беларускай мове, у “Руска-беларускім слоўніку” і падручніку па беларускай літаратуры ягоныя работы бачылі амаль ўсе землякі, хаця і не зьвярталі на гэта ўвагі, напэўна. Яшчэ ён і вершы піша. Такія вось на ўсе рукі майстры.

Маляваць Ігар пачаў вельмі рана. Ён паказвае свае рарытэтныя малюнкі, якія ніхто ня бачыў. Яшчэ ў садок хадзіў, а ўжо алеем па паперы крэмзаў, ствараў нацюрморты. І тушшу на фотапаперы спрабаваў маляваць. “Вырас я ў Жодзіна, горадзе Белазаў, — кажа ён. — Гэтыя машыны заўсёды ўражвалі мяне сваёй недасягальнасцю, я спрабаваў і іх паказваць на паперы”. Мастак дастае партрэт бацькі 1981 году, вось сапраўды ў сям’і творцаў можна абыйсьціся без фатакамэры, настолькі дакладна сын перадае рысы твару і характару бацькі. Яшчэ ёсць унікальны аркуш — малюнак, на якім зафіксаваная копія, якой ужо няма, скульптуры Маці Божай Язэпа Драздовіча.

Менавіта яны, бацька і сын, адкрылі імя гэтага незвычайнага мастака, езьдзілі ў шматлікія этнаграфічныя экспэдыцыі, каб дасьледаваць ягоную мнагагранную творчасьць. Пасьля выдалі вялікі каляровы альбом, якому няма цаны. Яны трымаюць яго ў руках, як каштоўнасьць, як дзіця, як мару, якая збылася і якую хочацца захаваць. Аляксей расказвае, што ў адной зь беларускіх вёсак, па якой ён падарожнічаў у пошуках маляваных дываноў, заўважыў, як адна бабуля нясе ў такім дыване сена жывёле, быццам гэта нейкаяануча. Ён прапанаваў новую посцілку ў абмен на гэты стары дыван. Бабуля доўга не хацела браць прыгожую крамную тканіну, маўляў, лепш яна ў старой паносіць, яе не шкада вымазваць, а пасьля згадзілася. І вось у Марачкіных вялікая калекцыя такіх адваяваных твораў. Аляксей таксама піша карціны, стылізаваныя пад гэтыя дываны. У цэнтры разьвіваецца нейкі сюжэт, і як раман, ён афармляецца прыгожым квяцістым узорам. Часта можна ўбачыць джунглі, зьвяроў у духу прымітывізму Анры Русо, напрыклад, “Два ільвы”, і можна зрабіць выснову, што гэты спосаб выяўленьня ўсечалавечы, ён зразумелы на ўзроўні архетыпаў. А творчасьць Драздовіча, менавіта гэтыя маляваныя дываны, вельмі паўплывалі на работы Марачкіных ды і на прафэсійнае беларускае мастацтва ў цэлым.

Яны могуць амаль усё, іх адносіны да новага, пераменаў, руху наперад вельмі філязофскія. Аляксей успамінае выраз Пікаса: “Калі-б у мяне блакітны пэрыяд зацягнуўся на дваццаць гадоў, я-б ужо даўно памёр”. Ён кажа, што неабходна зьмяняцца, бо перастаноўка рэчаў настройвае на новы лад. А калі прывыкаеш да абстаноўкі і адной і той-жа справы, узьнікае затарможанасьць. Нават у майстэрні нядаўні рамонт зрабілі з сынам, бо “неабходны парадак у памяшканьні і ў галаве”. Таксама Аляксея цікавяць новыя імёны ў айчынным мастацтве, ён мае мэту папулярызаваць незаслужана забытых мастакоў. Так, ён расказаў беларусам пра творцу, які працуе ў Санта-Моніцы, Міколу Пашкевіча. Калісьці зьвязаўся зь ім, запрасіў да сябе, угаварыў стварыць альбом, пасьля напісаў вялікі артыкул ў спэцыялізаванае выданьне “Літаратура і мастацтва”. І зараз ён шукае творы тых, каго можа ў жывых ужо няма, ці нябачаных раней майстроў, а бывае і тых, каго не прызнае дзяржава.

Сам мастак і ягоны сын імкнуцца фіксаваць беларускую рэчаіснасьць, прапускаць яе празь сябе творча, яны ўпэўненыя, што сёньня ў краіне — час вялікіх перамен, і задачай мастакоў і журналістаў зьяўляецца адлюстраваньне падзей такімі, якія яны ёсьць. “Наш камэртон — сумленьне і праўдзівасьць!” — завяршае размову бацька, літаратурны псэўданім якога Алесь Мара. Пагаварыўшы з гэтымі дабрадушнымі, таленавітымі і працавітымі людзьмі, якія зрабілі вельмі шмат для беларускай культуры, хочацца самой тварыць гэтак-жа плённа, быць такой-жа моцнай і з гумарам адносіцца да складаных сытуацый.

***Алена САБАЛЕЎСКАЯ***



***На здымках аўтаркі: Ігар Марачкін зь дзіцячай работай; група студэнтаў журфаку БДУ ў гасьцях у Марачкіных.***

## Паэтычная спроба

### Пакаяньне

Мне сорамна за словы гэтыя,
Мне сорамна, што гэта я раблю…
Бо праўда-ж, што асноўнай мэтай -
У лепшы кут схаваць душу сваю.

Я бачу, колькі нашай моладзі
Жадаюць жыць тут, як тыя - у кіно.
Таму и кажам мы, што ў лютым холадзе
на Плошчы былі зь імі за адно.

Што мы змагаліся разам за ідэю,
Што КДБ нас ловіць – таму і тут…
А самі плоцім грошы за паперу,
З даведкамі і позвай у суд.

Гэй, моладзь беларуская!
Што-ж дзецям будзем мы казаць?
Ужо калі ў нас мара гэта гнюсная –
Дык хоць адсюль на шчасце будзем працаваць

Краіны той, што нам усім жыцьцё дала,
Кутка з блакітнымі вачыма…
Мне палягчэла, што аб гэтым расказаў…
І ўсё-ж такі мне сорамна, Радзіма.

***Стась зь Берасьця***

*Бруклін, Нью-Ёрк. Травень 2008 году.*

Bielarus545C.qxd 6/6/2008 11:08 PM Page 7




# Весткі й Паведамленьні

Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня

Viestki j Paviedamlenni

Belarusan American Association, Inc.

166-34 Gothic Drive, Jamaica, N.Y. 11432 Сусьветнае сеціва: www.baza-belarus.org

№ 6 (509)


## Травеньскі сход аддзелу БАЗА

У Фундацыі імя Крэчэўскага ў Кўінсе 11 траўня адбыўся штогадовы справаздачна-выбарчы сход Нью Ёрскага аддзелу БАЗА. Напачатку сходу сакратар аддзелу сп-ня Валянціна Якімовіч нагадала прысутным пра маючае адбыцца 21-22 чэрвеня сьвяткаваньне Купальля і заклікала прыняць у ім актыўны ўдзел.

Затым была абраная выбарчая камісія ў складзе 4 чалавек (старшыня Т. Кулакевіч, сакратар М. Агароднік, сябры А. Мядзьведзік, Віталь Ракуць), якая ўзяла на сябе далейшае вядзеньне сходу. Тады адбылася рэгістрацыя сяброў аддзелу, галасаваньне пастанавілі зрабіць тайным.

Затым са справаздачамі выступілі старшыня алддзелу сп. Віталь Зайка, сакратар Валянціна Якімовіч і скарбнік Сяргей Пятровіч. З інфармацыяй пра фінансы аддзелу выступіў старшыня рэвізійнай камісіі сп. Валеры Дворнік.

Затым адбылося высоўваньне кандыдатураў на пасаду старшыні аддзелу. У выніку на пасаду старшыні аддзелу прэтэндавалі 2 асобы: Віталь Зайка і Валеры Дворнік. Абодва кандыдаты выступілі з сваімі праграмамі, прычым сп. Дворнік збудаваў сваю праграмную прамову на абвінавачаньнях дзейнага старшыні сп. В. Зайкі ў тым, што дасюль не набытае большае памешканьне для аддзелу, і што пагоршыліся адносіны зь цяперашнім кіраўніцтвам парафіяльнай рады сабору сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне. Прамова была большасьцю прысутных прызнаная тэндэнцыйнай, недарэчнай і непраўдзівай. Сп. А. Шукелойць заклікаў не мяшаецца ў рэлігійныя справы, бо БАЗА ёсьць чыста сэкулярная арганізацыя.

Затым адбылося тайнае галасаваньне, у выніку якога за сп. Зайку былі пададзеныя 52 галасы, за сп. Дворніка — 9.

Сп. Зайка быў прызнаны пераможцам у галасаваньні і атрымаў магчымасьць сфармаваць новую ўправу аддзелу. У выніку абмеркаваньня і галасаваньня была зацьверджаная ўправа Нью Ёрскага аддзелу БАЗА ў складзе: Валянціна Якімовіч (сакратар), Сяргей Пятровіч (скарбнік), Антон Шукелойць, Алесь Міцкевіч (ганаровы старшыня), Юля Андрусышын, Уладыка Юры (Э. Рыжы), Алла Орса-Романо, Марат Клакоцкі (заступнік старшыні), Зьміцер Левіт, Валеры Дворнік, Мікола Цімашэнка, Мікіта Агароднік, Андрэй Чыж, Тацьцяна Кулакевіч, Андрэй Мядзьведзік, Ільля Куніцкі, Вольга Луцкевіч, Аляксандра Макарук.

На прыканцы сходу слова ўзяў старэйшы сябар БАЗА сп. Антон Шукелойць, які коратка распавёў пра некаторыя моманты з гісторыі арганізацыі і адзначыў важнасьць папаўненьня яе маладымі сябрамі.

*Віталь ЗАЙКА*

## Сустрэча зь беларускімі валянтэрамі

У аўторак 6 траўня ў Фундацыі імя Крэчаўскага прайшла сустрэча зь беларускімі ўдзельнікамі праграмы распаўсюджваньня валянтэрскага руху і засваеньні прынцыпаў працы недзяржаўных ініцыятываў. Нажаль, зь дзесяці чалавек, што прыехалі зь Беларусі, на сустрэчу змаглі прыйсьці толькі пяцёра. Тым ня менш сустрэча прайшла цікава і зьмястоўна, у нязмушанай атмасфэры. Прыехала таксама кіраўніца праграмы сп-ня Рэнэ Бэрыан з Ўэйтсфілду (Вэрмонт). Прысутныя ўдзельнікі праграмы Тацьяна Мацкевіч, Алена Марыніна, Андрэй Саротнік, Марына Малініна, і сябры БАЗА абмяняліся навінамі, знайшліся агульныя знаёмыя. Было весела, госьці падмацоўваліся цудоўнымі прысмакамі й напоямі.

Перад грамадой выступіў знакаміты паэт і бард Сяржук Сокалаў-Воюш. Маленькая Паўлінка Падлеская прачытала беларускія вершы.

*В. ЗАЙКА*

## Сустрэча зь Пятром Рудкоўскім

У Фундацыі імя П. Крэчэўскага 23 траўня адбылася сустрэча зь беларускім культурніцкім і рэлігійным дзеячам а. Пятром Рудкоўскім. Ён нарадзіўся ў Канвелішках Воранаўскага раёну на Гарадзеншчыне. Скончыў Ягелёнскі ўнівэрсытэт у Польшчы. Ён тэоляг, філязоф, каталіцкі дыякан, сябра Дамініканскага ордэну, выкладчык лёгікі і мэтадалёгіі ў ЭГУ ў Вільні. Ён зьяўляецца сталым аўтарам часапісаў "АРХЭ", "Наша Вера", тыднёвіка "Наша Ніва", шэрагу папулярных інтэрнэт-рэсурсаў, вядзе блог у сеціўным "Жывым Журнале" пад імём john_cupala. Нядаўна з друку выйшла кніга аўтарства а. П. Рудкоўскага, якая называецца ''Паўстаньне Беларусі''.

У ЗША а. Пётр знаходзіцца па праграме нядаўна паўсталага Цэнтру Беларускіх Досьледаў у Канзасе. Госьць распавёў пра сваю дзейнасьць і творчыя пляны, пра каталіцтва ў Беларусі, пра ўзаемаадносіны беларусаў-каталікоў і каталікоў беларускага паходжаньня ў Беларусі. А. Рудкоўскі адказаў на пытаньні прысутных, у тым ліку адносна "карты паляка", што цяпер уводзіцца ўладамі Польшчы для суродзічаў на абшарах колішніх "крэсаў", і што стымулюе дзеля прычынаў сацыяльна-эканамічных далучэньне да "польскай нацыі". Закранутая таксама была дзейнасьць Цэнтру у Канзасе, зьмест кнігі "Паўстаньне Беларусі" ды іншыя пытаньні.

*В. ЗАЙКА*

## Наступны сход

нью-ёрскага аддзелу БАЗА адбудзецца **8 чэрвеня 2008 году** ў Фундацыі імя П. Крэчэўскага па адрасу:

*166-34 Gothic Drive, Jamaica, NY 11432*

Даезд цягніком падземкі **F** да прыпынку **169th St.**; адтуль прайсьці 2 блёкі ўверх да скрыжаваньня **167-й вул.** і **Готык Драйв.** Пачатак сходу а 1:00 папаўдні.

## ПАДПІСКА

**на выданьні зь Беларусі на другую палову 2008 году**

**З дасылкаю зь Беларусі ў замежжа:**

| | Назва, выдавец, мова | Пэрыядыч. друку | Кошт, $ |
|---|---|---|---|
| Газэты: | **Наша Ніва**, прыватная, беларуская | 4 на месяц | 85 |
| | **Наша Слова**, ТБМ, беларуская | 4 на месяц | 40 |
| Часапісы: | **Arche**, прыватны, беларуская | 5 на 6 месяцаў | 60 |
| | **Дзеяслоў**, прыватны, беларуская | 3 на 6 месяцаў | 30 |

**Жыхарам Беларусі (сваякам і знаёмым):**

| | Назва, выдавец, мова | Пэрыядыч. друку | Кошт, $ |
|---|---|---|---|
| Газэты: | **Наша Ніва**, прыватная, беларуская | 4 на месяц | 25 |
| | **Наша Слова**, ТБМ, беларуская | 4 на месяц | 10 |
| | **Народная Воля**, прыват., бел., рас. | 16 на месяц | 35 |
| Часапісы: | **Arche**, прыватны, беларуская | 5 на 6 месяцаў | 15 |
| | **Дзеяслоў**, прыватны, беларуская | 3 на 6 месяцаў | 10 |

Вы можаце выпісаць і іншыя выданьні зь Беларусі. Па інфармацыю зьвяртайцеся на адрас: *hazetabielarus@att.net*

***Заўвага:*** *газэты дасылаюцца авіяпоштаю, часапісы звычайнаю.*

***Дасылайце замовы на падпіску і аплату да 15 чэрвеня 2008 г. на адрас:***

***BIELARUS, P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735.***

***Чэкі, калі ласка, выпісвайце на імя BIELARUS.***

## Уплаты ў нью-ёрскі аддзел БАЗА

**Ахвяраваньні й складкі:**

| | | | |
|---|---|---|---|
| С. Аўраменка | 30 | З. Левіт | 30 |
| В. Балашчанка | 30 | А. Макарук | 30 |
| У. Бортнік | 30 | Р. Малахоўскі | 30 |
| А. Буйвал | 30 | Д. Молчан | 30 |
| М. Вашкевіч | 30 | Н. Мухамедаў | 30 |
| Т. Вашкевіч | 30 | В. Сідарук | 30 |
| А. Зялухіна | 30 | А. Старкоў | 30 |
| М. Капусьціна | 30 | Г. Сырыська | 30 |
| С. Капытка | 30 | М. Цімашэнка | 30 |
| М. Клакоцкі | 30 | В. Цішук | 30 |
| М. Кузьмянчук | 30 | А. Чыж | 30 |
| Т. Кулакевіч | 30 | В. Шымко | 30 |

**Уплаты ў нью-ёрскі аддзел дасылайце на адрас:**

*Belarusan American Association*
*P. O. Box 230249,*
*Brooklyn, NY 11223*

Чэкі выпісвайце на *Belarusan American Association.*

**Наведвайце інтэрнэт-старонку *Згуртаваньня Беларускай Моладзі ў Амэрыцы* www.zbma.net**

**Апэратыўная інфармацыя аб падзеях у дыяспары.**

Bielarus545C.qxd 6/6/2008 11:08 PM Page 8



# Нашая фанатэка

# Услаўляем Бога на роднай мове!




Цікавасць складанкі "Беларускі хрысьціянскі хіт" для слухачоў, якія сябе адносіць да хрысьціянскага веравызнаньня (праваслаўнай, каталіцкай ці пратэстанцкай канфэсій) палягае ў тым, што беларуская мова стала для ўсіх іх своеасаблівай лякмусавай паперкай аддананасьці Хрыстовым запаветам. Бо, як гаворыцца ў Бібліі: "На пачатку было Слова, і Слова было ў Бога, і Слова было Богам. Яно было на пачатку ў Бога" (Яна І 1-2. пераклад В. Сёмухі).

Цяперака многія герархі царквы Хрыстовай, якія прадстаўляць асноўныя канфэсіі, шукаюць новых шляхоў супрацы з паствою, асабліва з маладымі вернікамі-неафітамі. У якасьці праверанага сродку для гэтага абіраецца музыка: выступы сьпеўных гуртоў і хораў, музычных гуртоў камэрна-бардаўскай накіраванасьці, хрысьціянскіх рок-камандаў... Выканаўцы хрысьціянскіх сьпеваў часьцяком становяцца гасьцямі царкоўных службаў, а іх песьні выкарыстоўваюцца як сродак мацаваньня веры ў Збаўцу. У асяродку хрысьціянскіх выканаўцаў нават зьявіўся ўстойлівы выраз – "музычнае служэньне". Але ці выконваюць яны сваё прызначэньне ў наталеньні душаў слухачоў хрысьціянскімі пачуцьцямі, калі, напрыклад, песьні, быццам-бы хрысьціянскага зьместу, выкарыстоўваюцца як сродак дэнацыялізацыі і адмаўленьня ад сваёй мовы?

Канешне, цяпер многія выканаўцы, што нясуць сваё "музычнае служэньне" на расейскай, польскай ці ангельскай мовах, не наважваюцца ў адкрытую ганіць беларускую мову, бо могуць атрымаць суровую вымову ад кіраўніцтва сваёй царквы, ім нават могуць адмовіць у фінансаваньні такога вось "музычнага служэньня". Але калі іх прыпіраюць пытаньнем, кшталту: "Чаму вы не сьпяваеце на роднай мове сваёй краіны. Ці гэта па-Боску?" Такія выканаўцы пераводзяць праблему ў зусім іншую плоскасьць: "А сколько людей у нас говорят на белорусском языке?" Як гэта зрабілі ў сваім інтэрвію "Музычнай газеце" (№9, 2000 г.) удзельнікі расейскамоўнага гурта "Исаия".

Ну сапраўды, як патлумачыць такім "хрысьціянам", што паводле апошняга перапісу насельніцтва ў Беларусі да 41% жыхароў дома размаўляе па-нашаму, а 82% – прызналі беларускую мову роднай? Відавочна, што мы маем справу з маральным выбарам: некаторыя музыкі, якія дэкляруюць сваё пакліканьне ў хрысьціянскім служэньні, свой выбар робяць зусім не на карысьць Боскага ў жыцьці, а ідуць грахоўным шляхам, у першую чаргу, за камэрцыйнай выгадай. За што яны і нясуць сваю адказнасьць – іх праекты не даўгавечныя, безвыніковыя, як і іх творчасьць – марная. І каб ня іх спонсары з-за мяжы, якія не разумеюць беларускай моўнай сытуацыі і падтрымліваюць іх кволую творчасьць, то гэтыя праекты даўно зьніклі-б з музычнага далягляду, як і зьнік памянёны гурт "Исаия".

Іншая-ж пазіцыя выканаўцаў хрысьціянскіх сьпеваў, якія прытрымліваюцца ня толькі высокіх слоў пра сваё "музычнае служэньне" вернікам, а і нясуць хрысьціянскую любоў да бліжніх, да роднага слова, прадстаўлена на новай складанцы "Беларускі хрысьціянскі хіт". Дэвізам гэтага выданьня выбраныя ўзьнёслыя біблейскія словы: "Засьпявайце Госпаду песьню новую; засьпявайце Госпаду, уся зямля!..." (Псальмы 95:1). Трэба нагадаць, што ініцыятарам выданьня гэтай музычнай навінкі стаў адзін з арганізатараў партыі Беларускіх Хрысьціянскіх Дэмакратаў Павал Севярынец.

Відавочна, што, на думку Паўла і ягоных паплечнікаў, праграма дыска павінна быць дапаможнікам ў тым самым "музычным служэньні", пра якое кажуць выканаўцы, адносячыя сябе да хрысьціянскай плыні. А паколькі любое служэньне пачынаецца агульнай малітвай, то дыск "Беларускі хрысьціянскі хіт" распачынае нацыянальны хрысьціянскі гімн "Магутны Божа" Н. Арсеньневай і М. Равенскага, які вельмі хораша і ўзьнёсла выконвае хор Гарадзенскай капэлы.

Наступная, вельмі моцная старонка складанкі – падборка кампазыцый хрысьціянскага гурта TESAURUS, які працягвае праграму "Беларускага хрысьціянскага хіта" пранікнёнай кампазыцыяй з альбому "Аднова тэзаўруса" – "Гісторыя". Нельга не адзначыць некаторыя акалічнасьці творчасьці знакамітай каманды. Па-першае, TESAURUS – ад старту сваёй біяграфіі, якая распачалася пасьля рэфармаваньня гурта "Армагедон", – цалкам беларускамоўны хрысьціянскі праект. Гэтая акалічнасьць не давала спакою шмат каму, хто з розных мэтаў назваў сябе "христианами". Іх прэцэдэнт мог мець самыя нечаканыя вынікі для тых, хто зрабіл стаўку на расейшчыну. Таму было распачата сапраўднае паляваньне на TESAURUS: гурт некалькі гадоў ня мог трапіць на "Басовішча", яго ўдзельнікі, іх альбом "Аднова тэзаўруса" пазмоўніцку замоўчваліся, а галоўнае – вакол музыкаў быў створаны спонсарскі вакуум. У выніку гурт перастаў існаваць...




І усё-ж такі, творчасьць і прыклад TESAURUSа і цяпер працягвае зьвяртаць увагу і натхняюць слухачоў і выканаўцаў сваёй магутнай энэргетыкай і сапраўднымі хрысьціянскімі пачуцьцямі. Пра гэткі, нажаль недааценены, патэнцыял можна даведацца і асэнсаваць яго, калі праслухаць кампазыцыі "Гісторыя", "Дзе Ты?", "Асэнсаваньне веры" (аўтар верша Вітаўт Мартыненка), "Ерусалім" на верш Рыгора Барадуліна (у фармаце mp3). Пра тое, што існаваў папярэднік TESAURUSа – гурт "Армагедон" нагадваюць аднайменная песьня "Армагедон" ды "Наступны крок". Хоць на самой справе, гэтыя кампазыцыі – паўнапраўныя чыньнікі дэбютнага альбому TESAURUS'а. Чаму так адбылося? Думаю, на гэта ёсьць сваё тлумачэньне. Але праўда, нават у дробязях, павінна трыюмфаваць ва ўсім, што адносіцца да вызначэньня "хрысьціянскі"! Гэтую заўвагу трэба аднесьці да наступных выпускаў, на выпадак, калі складанка "Беларускі хрысьціянскі хіт" ператворыцца ў сэрыйнае выданьне. Дарэчы, на гэтым дыску можна знайсьці каманду, якая пры пэўных абставінах і высілках яе ўдзельнікаў, можа заняць тую нішу, якую займаў на нацыянальны рок-сцэне TESAURUS. Маю на ўвазе гурт DVA, чые песьні вылучаюцца рокавым драйвам і адыходам ад агульна прынятых канонаў хрысьціянскай поп-песьні.

Да цікавых дэбютаў з новага, сапраўды хрысьціянскага, дыску трэба аднесьці кампазыцыі гурта "Псальмяры". Сымптаматычна, што цяперака "Псальмяроў" падтрымлівае царква, якая ў свой час "дала дарогу" расейскамоўнаму "Новому Иерусалиму". Гэта сьведчыць пра паступовую зьмену моўных прыярытэтаў у пратэстанцкіх царквах розных кірункаў, які дзейнічаюць у Беларусі, пра разуменьне таго, што ігнараваць роднае слова – найвялікшы грэх!

Для складанкі "Беларускі хрысьціянскі хіт" "Псальмяры" прапанавалі кампазыцыі хрысьціянска-патрыятычнай скіраванасьці "Вечна жыві, мая Беларусь" і "На Беларусі Бог жыве" на знакаміты верш Уладзімера Караткевіча. Трэба адзначыць, што "Псальмяры" адпавядаюць сваёй назве і шмат увагі надаюць разгорнутым вакальным партыям, а таксама іх гарманізацыі з інтрумэнтальным суправаджэньнем.

Што тычыцца твораў яшчэ аднаго заўважнага гурта, які завецца "Хрысьціянскіе сьпевы", то іх яшчэ нельга назваць цалкам адпавядаючымі абранай тэматыцы. Выканаўцы бывае імкнуцца спалучыць неспалучальнае – папсовыя рытмы і хрысьціянскія матывы. Да таго-ж, у тэкстах песень "рэжуць вуха" русізмы, кшталту, "...і хочам каб ты яе спас!" ці "...дзіўны мір адкрыўся". Калі музыкі змогуць выправіць гэтыя недарэчнасьці ды адыйдуць ад штампаў, то можна прагназаваць, што гурт знойдзе сваё адметнае месца ў плыні хрысьціянскіх выканаўцаў. Тыя-ж высновы можна аднесьці да песень гуртоў "Сонца праўды", "Небасхіл", якія знаходзяцца на стылістычных скрыжаваньнях побач з гуртом "Хрысьціянскія сьпевы".

У суплёце твораў сьпевакоў-салістаў слухачы адзначаць магутны патас беларускага барда-трыбуна Андрэя Мельнікава, які нагадвае нам сваю знамітую песьню "Гэта мы!": "І хаця не відаць куды і надзея ні на каго, / Ты паслухай, зьвіняць званы! Гэта з намі гаворыць Бог!" Дый сьпявачка Алеся Ўнукоўская ў стане запаліць сваёй песьняй "Зоркі далёка" душы маладых вернікаў. На больш лірычны лад настройвае голас Інэсы Леаданскай (Дэмбскай), якая засьпявала сваю песьню "Хрыстос васкрос" на верш Янкі Купалы.

Як напамін пра часы Адраджэньня ХХ-га стагодзьдзя, надзеі на лепшае і сьветлае для незалежнасьці Беларусі і тую пастку, у якую трапілі сёньня іншыя непераборлівыя артысты, гучыць у выкананьні ансамбля "Сябры" цудоўная і ўзьнёслая "AVE MARIA" на верш Зянона Пазьняка. Гэта вам, шаноўныя сябры-музыканьцікі, не дрындушкі на патрэбу ўладзе, кшталту "Бацькі", кляпаць!

І каб не было прыкра ад гэтых алюзіяў, на заканчэньне праграмы дыску ў выкананьні хору брацтва Трох Віленскіх Пакутнікаў гучыць твор ці, кажучы сёньняшняй мовай, эвергрын, гіт на ўсе часы – кананічная малітва "Ойча наш" па-беларуску.

Будзем спадзявацца, што дзякуючы дыску "Беларускі хрысьціянскі хіт" высокая хрысьціянская тэматыка будзе ўсё дасканалей засвойвацца нашымі выканаўцамі, а слухачы атрымаюць яшчэ адзін шанец для сумоў'я з Богам праз родную мову і сучасную музыку.

*Анатоль МЯЛЬГУЙ*
*музычны аналітык,*
*http://mialguj.livejournal.com*

# Улада цемры

*Працяг з бачыны 2*

службовага становішча. З пункту гледжаньня нашай беларускай, традыцыйнай, праверанай стагодзьдзямі маралі аб талацэ, спачуваньні і абавязковай дапамозе пагарэльцам, такія паводзіны рэжымных функцыянераў мафіёзнай улады ёсьць хамскі, злосны зьдзек зь няшчасных, кашчунства над традыцыяй, абылганьне здаровага сэнсу.

Такія-ж цынічныя, хамскія і вымагальніцкія адносіны да беларускай змагарнай моладзі, да беларускіх дробных гандляроў і індывідуальных прадпрымальнікаў, да вернікаў нерэжымнай (г. зн. неправаслаўнай) рэлігіі, да чарнобыльцаў, ліквідатараў, беларускіх музыкаў, мастакоў і г. д.

У такіх умовах і пры чужой антынароднай уладзе вельмі істотна, каб у грамадстве захаваліся ідэалы, традыцыі ў душы; добрае, чыстае, сьветлае, беларускае і сваё – у сэрцы і дачыненьнях паміж сабой. Гэта ня дазволіць зьмірыцца зь цемрай, прывядзе да змаганьня, да вольнага зьместу жыцьця.

Цемрашальства антыбеларускага рэжыму асабліва выразна відаць у выбарах. Практычна, усе выбары за гэтым рэжымам былі недэмакратычнымі і былі сфальсіфікаваныя. У фальсіфікацыі незаконных выбараў прэзыдэнта ў 2006 годзе публічна прызнаўся сам фальсіфікатар А. Лукашэнка. Зразумела, што ён не хацеў гэта сказаць. Але яго падвялі дрэнная веданьне законаў, прымітывізм лёгікі і жаданьне быць арыгінальным. У выніку ён "прызнаўся" перад журналістамі, што "ва ўгоду Захаду" зьменшыў лічбу працэнтаў выбаршчыкаў, якія нібыта "прагаласавалі" за яго (бо, маўляў, надта шмат было). Небарака, відаць, думаў, што калі ён скажа пра зьмяншэньне адсоткаў не ў сваю карысьць, то гэта ня будзе выглядаць фальсіфікацыяй і ня выявіць ягонага незаконнага ўмяшальніцтва ў падлік галасоў і ўплыву на канцовы вынік галасаваньня. Фальсіфікацыйная машына падліку бюлетэняў тут адладжаная і простая, як кій. Пры адсутнасьці рэальнага кантролю над галасаваньнем і пры рэжымнай аднароднасьці выбарчых камісіяў галасы лічаць, як хочуць, але канцовы вынік падліку пішацца якраз у вертыкалі выканаўчай рэжымнай улады. (Якраз у гэтым па прастаце разумовай і прызнаўся А. Лукашэнка перад журналістамі ў лістападзе 2006 году.)

Заканадаўства аб выбарах, якое існуе, – далёкае ад дэмакратычных нормаў (і, зрэшты, ад Канстытуцыі). Яно дае магчымасьць правядзеньня галасаваньня цягам некалькіх дзён (так званае "папярэдняе галасаваньне"), што стварае ўмовы для маніпуляцыяў выбарчымі бюлетэнямі і для адміністрацыйнага ціску на выбаршчыкаў (іх, фактычна, прымушаюць браць удзел у галасаваньні, часам нават прывозяць на ўчасткі).

Практыкуюцца таксама падказкі, ціск, хаджэньне прадстаўнікоў выбарчай камісіі са скрынкамі для галасаваньня па дамох выбаршчыкаў і іншыя яшчэ сталінскія прыёмчыкі.

Маючы ўвесь гэты квазізаконны сурагат выбарчай сыстэмы, трэба ўлічыць яшчэ вельмі істотнае: парлямэнту як законнай, легітымнай і незалежнай галіны заканадаўчай улады ў Беларусі не існуе. Гэта прыдатак аўтарытарнай улады без самастойных правоў і магчымасьцяў. "Палатку" (так у народзе называюць гэты орган) кіраўнік рэжыму можа нібыта законна (па

*Заканчэньне на наступнай бачыне*

Bielarus545C.qxd 6/6/2008 11:09 PM Page 9



# Сьведчым за сваю апрычонасьць

14-е стагодзьдзе прынесла на землі летапіснае Русі ня толькі шырокую плынь праскіх грашоў, але і ўзнаўленьне собскае манэтнае вытворчасьці. У другой палове стагодзьдзя зьяўляюцца першыя манэты ВКЛ. Гэты пэрыяд мынцарства дзяржавы яшчэ недастаткова дасьледаваны, некаторыя тыпы манэтаў вядомыя навуцы меней за дзесяцігодзьдзе, а ў бліжэйшай будучыні імаверна адкрыцьцё новых тыпаў, якія могуць дапоўніць і нават зьмяніць існую клясыфікацыю.



*Пенязь Уладзімера Альгердавіча з пляценкай, м. Кіеў. (Канец 1360–х – 1370–я гады)*

Куды-ж сягаюць пачаткі мынцарства Вялікага Княства? Эмісіі собскіх манэтаў на тэрыторыі Кіеўскага княства ёсьць, падобна, найстаражытнейшымі з усіх земляў, якія ўваходзілі ў склад ВКЛ. Пасьля далучэньня Кіеўскага княства да ВКЛ на кіеўскі пасад сеў адзін з старэйшых сыноў Альгерда – Уладзімер, які распачаў біцьцё сваіх собскіх манэтаў, магчыма, ужо ў 1360-я. Дакладна акрэсьліць дату пачатку грашовых эмісіяў Уладзімера пакуль не выпадае. Гэта цалкам арыгінальныя манэты, на адным баку якіх быў зьмешчаны асабісты кляйнод князя, а на другім – ягонае імя, напісанае кірыліцай па коле. Выраблялія яны па тэхналёгіі, запазычанай з Залатое Арды – з срэбнага дроту. Срэбра выцягвалася ў доўгі дрот, які пасьля разразаўся нажніцамі і раздушваўся вытнем молата. Атрыманы кавалак і быў манэтнай загатоўкай. Гэта тэхналёгія была зручнай і менш працаёмкай, выдатна пасуючы вытворчасьці дробных пенязяў. Манэты Кіеўшчыны эмітаваліся да пачатку 1390-х гадоў. Вядомыя і мясцовыя выпускі манэтаў з Падольля.



*Манэта Дзьмітра Бранскага.*

У 1362 годзе да ВКЛ Альгердам былі далучаныя і Северскія землі, дзе свае ўдзелы атрымалі ягоныя сыны Дзьмітры і Касьцянцін, пазней Дзьмітры-Карыбут, а таксама нашчадкі старэйшага брата Альгерда князі Нарымонтавічы. Бальшыня



*Дзяньга старадубскага князя Аляксандра Нарымонтавіча з кірылічнай легендай. (Канец 1360–х гадоў)*

гэтых князёў білі свае ўдзельныя манэты, якія разам з кіеўскімі манэтамі Ўладзімера Альгердавіча склалі аснову ўласных грашовых сыстэмаў, што існавалі на ўсходніх тэрыторыях ВКЛ у другой палове 14-га стагодзьдзя.

Першыя вялікакняскія манэты пачалі эмітавацца ў канцы 1370-х гадоў, магчыма, яшчэ Альгердам. Што-ж паслужыла штуршком для эмісіяў собскае манэты ў Вільні? Верагодна, яны пачаліся не раней за прызнаньне ВКЛ хрысьціянскай дзяржавай, бо манэты нясуць на сабе сымболіку хрысьціянства – крыж. Гэта здарылася 2 сьнежня 1375 году. У гэты дзень канстанцінопальскі патрыярх Філафей пасвяціў у мітрапаліта "кіеўскага, рускага і літоўскага" Кіпрыяна, што прычынілася да атрыманьня Вялікім Княствам статусу праваслаўнае дзяржавы. Узровень рынкавых адносінаў на той час таксама вымагаў ад уладара ўвядзеньня собскае дробнае манэты поруч з сродкамі буйнога гандлю – срэбнымі пруткамі і прывазнымі праскімі грошамі.

Біцьцё манэтаў прыпыняецца па захопе ўлады Кейстутам. Па аднаўленьні сваёй улады праз год, Ягайла працягнуў біцьцё манеты, якая захавала свой ранейшы выгляд, але страціла ў якасьці дзеля неўстойлівасьці "навароджанае" цэнтралізаванае грашовае сыстэмы ВКЛ і жаданьня эмітэнта даставаць болей прыбытку з свае манэтнае рэгаліі.

Новы этап у вялікалітоўскім мынцарстве зьвязаны з Скіргайлам. З часу ягонага намесьніцтва да атрыманьня фактычнае ўлады ў гаспадарстве праз Вітаўта (у 1392 годзе), шматлікія пенязі выбіваліся паралельна з рознымі матывамі, напару на розных мастацкіх узроўнях. Цягам 1390-1392 гадоў адбылася рэзкая дэвальвацыя манэтаў ВКЛ. У тыя гады вялося актыўнае ходаньне паміж Ягайлам і Вітаўтам за ўладу ў краіне, што і спрычынілася часткова да хуткага псуцьця манэты. Асабліва ў часе вайны адчуваўся дэфіцыт срэбра, выкліканы таксама бракам собскіх радовішчаў. Да 1390-га году пенязі мелі даволі стабільную вагу і высокую пробу, а затым хутка замясьціліся ў абарачэньні менш якаснымі. Ягайла і далей, ужо на польскім каралеўскім пасадзе, ня надта прытрымліваўся прынцыпу выбіцьця якаснае манеты. Як сьведчаць польскія летапісныя жаролы, кароль у "справах манэтарных кіраваўся вылучна прыбыткам".



*Пенязь літоўскі Ягайлы. (Каля 1387–1388 г.г.)*

Першыя манэты Вялікага Княства былі самастойным наміналам, які меў пераменны курс ад 1/2 да 1/10 да праскага гроша на працягу 15 гадоў з канца 1370-х да 1392-1393. Толькі ў выніку рэформы Вітаўта пенязь быў трывала прывязаны да праскага гроша ў наватарскай для сярэднявечча дзесяцічнай прапорцыі (10:1).

Вывучэньне сярэднявечных манэтаў Вялікага Княства праходзіць лавінападобна на працягу апошніх 10 гадоў. Вынаходніцтва дасканалейшых металапашукавых прыладаў, павышаны інтарэс і колькасьць новых дасьледнікаў-нумізматаў, што стала павялічваецца, робіць старыя публікацыі на гэтую тэму неактуальнымі. Балазе, новых публікацыяў, якія месяцць напару сэнсацыйныя адкрыцьці, не бракуе. Што-ж, тым цікавей сачыць за імі і лавіць сябе на думцы – як-жа шмат мы яшчэ ня ведаем пра гэты вірлівы пэрыяд нашае гісторыі!

*Дзьмітры ГУЛЕЦКІ (dhulecki@belcoins.com)*

## Улада цемры

*Заканчэн. з папярэдняй бач.*

рэжымным законе) ліквідаваць зь любой нагоды і набраць іншы камплект – былаб прычына і патрэба.

Для правдзеньня фальсіфікацыйных выбараў у гэтай сітуацыі і для стварэньня бачнасьці справядлівага галасаваньня і дэмакратычнага выбарчага працэсу рэжым мусіць забясьпечыць найперш два аспэкты дзеяньня: удзел розных палітычных арганізацыяў (пажадана "апазыцыйных") у бяссэнсавых для іх выбарах і другое – вялікі (пажадана масавы) удзел выбаршчыкаў у галасаваньні. Тады фальсіфікацыя выглядае "элегантнай перамогай" з большай паловай усіх выбаршчыкаў "за" (а не якія-небудзь 30 адсоткаў пры малой "фрэквэнцыі"). Хаця і тут "машына" навучана "накідаць".

Для такога роду выбарчых камэдыяў рэжым стварае свае "апазыцыйныя" арганізацыі, знаходзіць падстаўных асобаў, якія заклікаюць усіх ісьці на выбары ды сказаць рэжыму сваё цьвёрдае "нет!" і г. д. У Беларусі гэтакая гэбоўская схема адпрацавана даўно, нудна і жмудна, аж да стэрэатыпаў, з разьмеркаваньнем роляў, салістаў і вызначэньнем паводзінаў.

У апошні час, з умацаваньнем гэбізму і карпаратыўнай дыктатуры ў Расеі, лукашыцкі "вопыт" выбараў пачала пераймаць лубянская Масква. Сыстэма гэбоўскага выбарчага ашуканства ў Беларусі ўжо закасьцянела і сфармавалася настолькі маналітна, што разбурыць яе можна, відаць, толькі разам з антыбеларускім рэжымам.

У гэтых умовах удзельнічаць у так званых парлямэнцкіх выбарах у Беларусі, што ўжо прызначаныя на верасень, ня толькі бяссэнсоўна, але найперш шкодна. Гэта, фактычна, падыгрываць рэжыму ў ашуканстве людзей. Беларускі Народны Фронт і яго народная Партыя (КХП-БНФ) не павінны ўдзельнічаць у такіх "выбарах".

Зразумела, таксама, што наяўнасьць падстаўной "апазыцыі" забясьпечыць фармальны ўдзел фармальна "апазыцыйных" партыяў у рэжымных выбарах. Яны будуць ствараць фармальную бачнасьць дэмакратычнага працэсу, як Гайдукевіч – фармальную альтэрнатыву Лукашэнку. Такая роля гэтых людзей, і ніякія доказы, угаворы, лісты, скіраваныя да іх, ня маюць сэнсу. (Мы ўсё гэта перажылі.)

Тым часам вялікай "масавасьці" галасаваньня цяперашняя падстаўная "апазыцыя" ня зробіць (хоць і паспрыяе). "Масавасьць" звычайна стварае найперш сам рэжым. І тут трэба супрацьдзейнічаць выбарчаму ашуканству, заклікаць беларусаў ня йсьці на галасаваньне, байкатаваць фальсіфікацыю і недэмакратычныя выбары, тлумачыць людзям, чаму гэта неабходна рабіць, чаму трэба пакінуць рэжым гуляць самаму з сабой і не падтрымліваць парушэньне закону і нішчэньне правоў народу Беларусі, памятаючы, што маральная перамога ёсьць вялікая перамога і шлях перамогі. **Б**

## Сьв. пам. Антаніна ЖАРСКАЯ
## (25.XII.1919 - 25.XI.2007)



3-га сакавіка сёлета на 99-м годзе жыцьця адыйшла на вечны супакой Антаніна Жарская. Нарадзілася яна ў маёнтку Дубавое Мядзельскага раёну, якое належала яе бацькам, Усьціну і Стэфанідзе Дубяга. Антаніна мела тры сястры й два браты.

Калі Антаніне было 17 гадоў, яна выйшла замуж за Яна Жарскага, беларускага праваслаўнага сьвятара. У гэтым шлюбе нарадзілася двое дзяцей: Таіса і Ўладзімер. Калі пачалася 2-2-я сусьветная вайна, сям'я Жарскіх знаходзілася ў Радашковічах, дзе а. Ян меў парафію. У 1944-м годзе Жарскія пакінулі Радашковічы, бо набліжаўся фронт. Спыніліся яны ў Чэхаславаччыне, а пазьней у Баварыі, дзе жылі ў лягерох ДП, у тым ліку ў лягеры Гірзгайм. У лягерох а. Ян праводзіў багаслужбы для беларусаў. Пакінуўшы лягеры Жарскія пачалі жыць на прыватнай кватэры ў Гайдэльберку. Антаніна працавала кухаркай на амэрыканскіх акупацыйных прадпрыемствах. Айцец Ян атрымаў пасаду ў Сусьветнай Радзе Цэркваў (World Council of Churches).

Антаніна мела надзвычай добрае сэрца. Калі ў 1943-м годзе савецкія партызаны забілі ў Даўжанях Мядзельскага раёну яе сястру Галіну Дубяга, Антаніна ўзяла да сябе ў Радашковічы чацьвёра дзяцей сваёй сястры: тры дзяўчынкі й хлопца. Калі прыйшоў час пакінуць Бацькаўшчыну, сіроты выехалі на захад разам зь сям'ёю Жарскіх.

У 1954-м годзе сям'я Жарскіх эміґравала ў Амэрыку.

Антаніна таксама была добрая да сваіх дарослых дзяцей. Ім перадала грошы, атрыманыя з продажу зямлі ў Гадсан Рывэр Валей, якую а. Ян і матушка Антаніна набылі пасьля свайго прыезду ў Амэрыку.

У 1960-х гадох а. Ян адыйшоў на той сьвет, пакінуўшы Антаніну ўдавой. Пасьля ягонай сьмерці Антаніна пасялілася ў Нью-Мілфардзе, штат Пэнсыльванія. Жыла там некалькі гадоў. Там яна таксама набыла зямлю. Калі наступіла старасьць, тады перапісала сваю маёмасьць дзецям.

Пахавалі Антаніну Жарскую на магілках St. Tikhos у Саўт-Кэнан, Пэнсыльванія. Магіла Антаніны знаходзіцца побач з магілай а. Яна.

*С. ШАБОВІЧ*

Bielarus545C.qxd 6/6/2008 11:09 PM Page 2



# КУПАЛЬЛЕ

**Сябры! Давайце разам адзначым нашую прыгожую традыцыю Купальля.**

**Калі:** **20-22 чэрвеня 2008 году** (Купальская ноч у суботу 21 чэрвеня).

**Дзе:** Рэзэрвацыя ***Ward Pound Ridge*** ў ***Cross River, NY***.

**Транспарт:** цягнікам са станцыі ***Grand Central*** да прыпынку ***Katonah***. Гэта прыкладна гадзіна язды цягнікам ад Мангэтану на ***Metro North, Harlem Line***.

**Кошт:** **$25** дарослым, **$10** дзецям меншым за 12 гадоў. Чэкі выпісвайце на ***Mr. & Mrs. Ryzy*** з адзнакаю "***Купальле***" і дасылайце разам з формаю, надрукаванаю ніжэй, на адрас:
***Piotr & Lena Ryzy***
***20 Old Locust Avenue***
***Cortlandt Manor, NY 10567***

**Кантакты:** **Пётра** і **Алена РЫЖЫЯ**, хатні тэл. **(914) 930 - 8695**, маб.**(914) 522 - 0742**, эл. пошта: ***LenaBelarus@aol.com***

**Што будзе:** купальскія песьні й танцы на працягу ўсёй ночы, спартовыя спаборніцтвы й гульні, гатаваньне страваў (прыносьце ежу, грылі там будуць).

**Захапіце з сабою:** - беларускія строі ці адзеньне з сымболікай; дзяўчатам - доўгія спадніцы, хлопцам - доўгія сьветлыя штаны, ня шорты (толькі на час сьвткаваньня);
- ежу, напоі, спальныя мяшкі, намёты, калі будзеце спаць;
- **$8** (з аўта ў незалежнасьці ад колькасьці пасажыраў) за ўезд у парк (бясплатна пасьля 5-й гадзіны вечара).

Арганізатары забясьпечаць пітную воду і паліва для вогнішчаў і грыляў.

**Імя:** ______________________________

**Дарослых ($25):** ___, **дзяцей ($10):** ___ **Усяго дасылаю: $** ____

**Ваш тэлефон:** ______________ **E-mail адрас:** ______________

**Паштовы адрас:** ______________________________
______________________________

**Ці трэба Вас забіраць з прыпынку цягніка?**___ **Калі?** _______

**Ці даслаць Вам мапу з інструкцыяй, як даехаць да парку?** ____

Беларуская праваслаўная царква сьв. Еўфрасіньні Полацкай у Саўт Рывэр, Нью-Джэрзі, ветліва запрашае Вас, Вашую сям'ю і Вашых знаёмых на сьвяткаваньне беларускіх традыцыяў.

**Сёлета парафіяльны камітэт ладзіць 9-ы**

# Беларускі Фэстываль - 2008

у царкоўным парку і залі ў суботу **28-га чэрвеня 2008 году**
**Пачатак а 11-й гадзіне раніцы, заканчэньне а 8-й вечара.**

Прыходзьце на смачныя стравы. Будуць гучэць беларускія фальклёрныя мэлёдыі і прадавацца сувэніры. Фэстываль адбудзецца ня гледзячы на надвор'е - "Ці сонца, ці дождж!"

**З пытаньнямі званіце ў Беларускі Грамадзкі Цэнтар (732) 613-7171.**

# 28-я Сустрэча Беларусаў Паўночнай Амэрыкі

**Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне (БАЗА) і Згуртаваньне Беларусаў Канады (ЗБК) паведамляюць, што чарговая Сустрэча Беларусаў Паўночнай Амэрыкі адбудзецца**

## 30-31 жніўня 2008-га году

**ў Беларуска-Амэрыканскім Грамадзкім Цэнтры *ПОЛАЦАК*, у ваколіцы гораду Кліўленду, штат Агаё.**

Падрабязная праграма Сустрэчы будзе падавацца ў наступных паведамленьнях.

Пакуль што ў праграме прадбачваецца канцэрт з удзелам артыстаў і гуртоў з розных асяродкаў Паўночнай Амэрыкі, урачысты банкет і менш фармальны пікнік зь беларускай кухняй, выставы кніжак і ручных вырабаў, гульні, музыка і танцы.

Адбудзецца канфэрэнцыя на актуальныя тэмы году і з ганаровым госьцем зь Беларусі, а ў нядзелю раніцай – Багаслужба.

З больш асяродкаў будзе зарганізаваны транспарт, а гаспадар Сустрэчы - Кліўлендзкі аддзел БАЗА, замовіць начлег у мясцовых гатэлях ды матэлях.

**З пытаньнямі й прапановамі зьвяртайцеся па тэлефонах: у ЗША *(732)222-1951*, у Канадзе *(905)760-7447* альбо пішыце на e-mail адрас: *BAZA.HQ@hotmail.com***

***Газэта "БЕЛАРУС" бясплатна надрукуе кароткія прыватныя паведамленьні й абвесткі некамэрцыйнага характару, віншаваньні, запрашэньні, спачуваньні ды інш. Наконт разьмяшчэньня рэклямы кантактуйце рэдакцыю.***

## УДАКЛАДНЕНЬНЕ

**У сёлетнім сакавіцкім нумары "Беларуса" ахвяраваньні "Заміж кветак на магілу Кастуся АКУЛЫ" трэба чытаць так:**

| | |
|---|---|
| Др. О. Качан. . . . аўстр. дал. | .500 |
| М. Лужынскі | .250 |

**Прабачце за недакладнасьць.**

## НА ВЫДАВЕЦКІ ФОНД "БЕЛАРУСА" АХВЯРАВАЛІ:

| | |
|---|---|
| К. і Я. Вініцкія | .50 |
| Ж. Дубяга | .40 |
| В. Станкевіч | .35 |
| У. Бортнік | .30 |
| Р. Жук-Грышкевіч | .30 |
| Н. Мамедаў | .30 |
| А. Раінчык | .30 |
| Л. Шурак | .30 |
| П. Каян | .25 |

**Заміж кветак на магілу Язэпа САЖЫЧА:**

| | |
|---|---|
| М. Прускі | .50 |

**Усім шчыры дзякуй!**


# БЕЛАРУС

*Газэта Беларусаў у Вольным Сьвеце*

**Выдае штомесячна:**
***Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне***
**Сусьветнае сеціва: *baza-belarus.org***
**Падпіска $30 на год.**
**Чэкі выпісвайце на *BIELARUS***

# BIELARUS

*Belarusan Newspaper in the Free World*

Published monthly by
***Belarusan American Ass'n, Inc.***
Subscription $30 yearly
Make checks payable to ***BIELARUS***

**Рэдагуе калегія.**
**Адказны рэдактар Марат КЛАКОЦКІ**
**Падпіска Сяргей ТРЫГУБОВІЧ**

**Артыкулы, падпісаныя прозьвішчам ці ініцыяламі, могуць зьмяшчаць погляды, зь якімі Рэдакцыя не згаджаецца.**
**Перадрук дазваляецца толькі пры ўмове зазначэньня крыніцы.**


© BIELARUS, 2008


**Адрас для допісаў і кантактаў:**
***BIELARUS***
***P.O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***
E-mail:
***hazetabielarus@att.net***
**Сусьветнае сеціва:**
***www.bielarus.org***


ISSN 1054-9455

**Адказнасьць за зьмест рэклямы нясе рэкламадаўца.**

# 90-я ўгодкі БНР у Мантрэалі

Сьвяткаваньне 25 Сакавіка Згуртаваньне Беларусаў Квэбэку правяло ў Мантрэалі 30 сакавіка ў Centre Communautaire Cote-des-Neiges. Імпрэза прайшла згодна праграмы, якая была надрукаваная ў сакавіцкім нумары "Беларуса".

Ніжэй друкуем агульны здымак удзельнікаў сьвяткаваньня ў Мантрэалі, дасланы сп. Анатолем Хрэноўскім.

